# Змест

Уводзіны
1. Карта
2. Дадаткі:
1) Мемарыяльны комплекс “Барок”
2) Помнік на месцы расстрэлу і пахавання палякаў
3) Мемарыял спаленым вёскам Глыбоцкага раёна
4) Помнік вязням гета
5) Брацкая магіла воінаў і партызан, якія загінулі пры вызваленні Глыбоцкага раёна ў ліпені 1944 года
6) Помнік падпольшчыкам Глыбоцкага падполля
7) Падсвілле. Брацкая магіла воінаў і партызан
8) Вёска Кішы. Помнік землякам, загінуўшым у гады Вялікай Айчыннай вайны
9) Вёска Галубічы. Помнік ахвярам вайны
10) Брацкая магіла абаронцаў Айчыны і ахвяр вайны каля в.Галубічы
11) Вёска Каралевічы. Брацкая магіла
12) Вёска Празарокі. Брацкая магіла савецкіх воінаў і партызан
13) Вёска Чарневічы. Помнік-абеліск землякам, загінуўшым у гады Вялікай Айчыннай вайны
14) Урочышча Марусіна. Памятны знак ахвярам халакосту
15) Галубіцкая пушча. Курган Славы
Помнік-стэла на месцы дыслакацыі Штаба 1-й партызанскай брыгады імя А.В.Суворава
Урочышча Зімнік. Абеліск-указальнік месца былога партызанскага аэрадрома
Памятны знак на месцы размяшчэння штаба партызанскай брыгады імя Суворава
Памятны знак на месцы жорсткіх баёў каля р.Чысцянка
Брацкая магіла партызана
16) Памятны знак на месцы спаленай вёскі Белякі
17) Вёска Ліпава. Брацкая магіла ахвяр фашызму
18) Вёска Вострава. Помнік Пліскім падпольным райкамам КП(б)Б і ЛКС
19) Вёска Вострава. Брацкая магіла воінаў і партызан
20) Вёска Псуя. Помнік-стэла загінуўшым землякам
Мемарыяльны знак у гонар генерал-лейтэнанта Казлова Пятра Міхайлавіча

21) Вёска-партызанка Хралы
22) Вёска Івесь. Помнік землякам
23) Помнік спаленай вёсцы Вуглы
24) Вёска Празарокі. Брацкая магіла савецкіх воінаў і партызан
25) Вёска Гатаўшчына. Помнік-абеліск землякам, загінуўшым у гады Вялікай Айчыннай вайны
26) Брацкая магіла ахвяр вайны, жыхароў-яўрэяў в.Пліса
27) Вёска Мнюта. Помнік землякам, загінуўшым у гады Вялікай Айчыннай вайны
28) Вёска Мацюкова. Помнік землякам, загінуўшым у гады Вялікай Айчыннай вайны
29) Вёска Ломашы. Помнік-абеліск  землякам
30) Вёска Карабы. Помнік–абеліск землякам
31) Вёска Гінькі. Брацкая магіла сям'і Шчасных
32) Вёска Гірстуны. Брацкая магіла лётчыкаў
33) Вёска Гулідава. Індывідуальная магіла невядомага воіна
34) Вёска Дзеркаўшчына. Помнік землякам, загінуўшым у гады Вялікай Айчыннай вайны
35) Індывідуальная магіла невядомага, загінуўшага ў 1941 г
36) Вёска Зарубіна. Помнік — скульптура жанчыны ў жалобе
37) Вёска Латыгаль. Абеліск – мармуровая стэла
38) Вёска Шунеўцы. Помнік землякам, загінуўшым у гады Вялікай Айчыннай вайны
39) Індывідуальная магіла чырвонаармейца Пятра
40) Вёска Зябкі. Помнік памяці землякам
41) Вёска Запруддзе. Помнік загінуўшым землякам
42) Вёска Капыльшчына. Помнік-абеліск землякам
43) Вёска Лучайка. Помнік землякам

Помнік на месцы расстрэлу сям'і Міроша Нікандра Іванавіча за сувязь з партызанамі

44) Вёска Дылевічы. Помнік на месцы расстрэлу за сувязь з партызанамі сям'і Жука Уладзіміра.

# Уводзіны

*А вам жа таксама хацелася жыць,*
*І вы ж па спакоі тужылі...*
*І крыўда балючай слязою бяжыць...*
*Былога туманяцца мілі…*

З цягам часу ў людзей знікае з памяці такое слова як "вайна". Так, гэта было ўжо амаль 75 гадоў таму, зараз усё зусім інакш. Але дзякуючы чаму? Усё гэта дзякуючы тым, у каго хапіла мужнасці, стойкасці і адвагі, каб супрацьстаяць ворагу. Людзі не задумваліся, што рызыкуюць сваім жыццём. Яны проста аддана ішлі абараняць сваю зямлю, сваю Радзіму. Абаронцы ўсёй Беларусі падаравалі нам светлае і чыстае неба над галавой, яснае сонейка, а галоўнае – спакойнае і мірнае жыццё. Але ўсё адно – не трэба забывацца пра такія страшэнныя падзеі як вайна. Калі не забывацца на сваё мінулае, яно не павінна паўтарыцца. А як жа даведацца, што было тады, у часы вайны? На жаль, рэальных сведкаў тых падзей з кожным годам становіцца ўсе менш і менш. Скора ўвогуле не застанецца ні ўдзельнікаў, ні сведкаў Вялікай Айчыннай вайны. А хто данясе да нас ваенную гісторыю, хто раскажа праўду – як яно было на самой справе? Адно я магу сказаць упэўнена: не горш за людзей нам распавядаюць помнікі і кнігі. Яны – адны з лепшых крыніц інфармацыі.

У розных кутках Беларусі, якая страціла ў 1941-1945 гадах кожнага трэцяга жыхара, створаны сімвалічныя мемарыяльныя комплексы, устаноўлены манументы, прысвечаныя падзеям самай трагічнай і кровапралітнай вайны на гэтай шматпакутнай зямлі.

Сёння ў краіне каля 9 тысяч помнікаў і пахаванняў Вялікай Айчыннай вайны.

Яны ўваходзяць у ваенна-гістарычныя маршруты і экскурсіі, але галоўнае – з'яўляюцца святым месцам ушанавання загінутых, вечным напамінам аб тым, які каштоўны мір ...

Аб цяжкіх выпрабаваннях мінулай вайны, якія выпалі на долю жыхароў Глыбоцкага раёна напамінаюць помнікі, абеліскі, брацкія магілы з прозвішчамі воінаў, якія загінулі, закатаваных жыхароў, расстраляных партызан.

Як памяць і глыбокая пашана да загінутых стаяць сёння на Глыбоччыне помнікі ахвярам Вялікай Айчыннай вайны.

# Дадаткі

Дадатак 1

## г. Глыбокае. Мемарыяльны комплекс “Барок”









Мемарыяльны комплекс “Барок” прысвечаны памяці 27 тысячам савецкіх ваеннапалонных – ахвярам працоўнага лагера ў Беразвеччы. У брацкай магіле таксама захаваны 20 італьянскіх ваеннапалонных.

У 1946 годзе на ўшанаванне памяці загінуўшых ў Барку былі пастаўлены 2 помнікі-абеліскі.

У 1964 г. на месцы шматлікіх пахаванняў ваеннапалонных і мірнага насельніцтва быў створаны мемарыяльны комплекс “Барок”. Першапачаткова комплекс складаўся з абеліска, скульптуры воіна і 27 агульных магіл з выявай зоркі на кожнай.

У 1993 г. была распрацавана новая кампазіцыя мемарыяльнага комплексу “Барок”, аўтарам якой стаў мінскі скульптар В.Якавенка. Комплекс прадстаўляе сабой суцэльны архітэктурна-скульптурны ансамбль, аб’яднаны адной ідэяй – народ ніколі не забудзе той жудасны час, калі гінулі людзі і не дапусціць распаўсюжвання фашызму. Мемарыяльны комплекс быў урачыста адкрыты 3 ліпеня 1994 года ў 50-ю гадавіну вызвалення Глыбоччыны ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

Ён уключае: “Алею памяці” з 27 камянямі, дзе кожны камень азначае тысячу загінутых; два помнікі – ваеннапалонным (салдат, які валіцца ў яму) і грамадзянскім ахвярам (два крыжы з мемарыяльнымі надпісамі).

Сёння тут знаходзіцца буйны мемарыяльны комплекс “Барок”, прысвечаны памяці 27 тысячам савецкіх і італьянскіх ваеннапалонных – ахвярамфашысцкага канцлагера ў Беразвеччы.

Першапачаткова на паўночна-заходнім ускрайку горада ва ўрочышчы Барок у 56 магілах былі пахаваны ваеннапалонныя і ўсталяваны ў 1964 годзе два помнікі – абеліск і скульптура воіна. А мемарыял быў адкрыты ў 1994 годзе (скульптар А.Якавенка).

Пасля рэканструкцыі мемарыял уяўляе сабой два помнікі. Распяцце на крыжы з подпісам-зваротам на бакавых плітах:

Людзі добрыя, памятайце!

Яны любілі жыццё, Радзіму і вас!

Пусть с вами будет Божья благодать!

І пастамент з каменнай глыбай і целам закатаванага палоннага пад калючым дротам.

На тэрыторыі комплекса размешчаны дваццаць сем валуноў з лічбай 1000, якая сімвалізуе кожную забітую тысячу салдат.

## Барок

Барок зімовы, золкі і каляны
Каля магіл іменн-безымянных,
Нам памяць ціха затуманіць зрок.
Барок трагічны, горкі наш Барок!

Чытаў і ты гісторыю "Арміры".
Ці даляціць да сонца голас міру,
Ці вернецца цяплом да мацярок
Барок балючы, горкі наш Барок?

Трагічнае пасведчанне паляны.
Зямля вам пухам, дзеці італьянак.
Матулям вашым не пашле папрок
У мужнай скрусе сцішаны Барок.

Вайною неба здратавана.
Вось тут усё, што вам наканавана:
Агульная зямля, траншэі, змрок…
Заледзянеў ад шэрані барок.

Не будзе ў Італію вяртання.
Зямля навек зацвердзіла братанне.
Было выпрабаванне, быў урок.
Барок трагічны, горкі наш Барок!

Сачыцца боль агульначалавечы
Зямля навек зацвердзіла братанне.
Было выпрабаванне, быў урок.

Барок трагічны, горкі наш Барок!

Сачыцца боль агульначалавечы
З галінак дрэў за вёскай Беразвечча.
А зло яшчэ нам не дало зарок…
Барок трывожны, мужны наш Барок!

*Марыя Баравік*

Дадатак 2

## Помнік на месцы расстрэлу і пахавання палякаў

Іх прытулак – магіла,
Там ляжыць шмат братоў,
Смерць усіх парадніла
З-за калючых дратоў.
*Тумаш Загорскі*





Сярод ахвяр – тры ксяндзы, растраляных 4 сакавіка 1942 г. за падтрымку польскага антыфашысцкага падполля, і 30 палякаў, расстраляных 4 ліпеня 1942 г. У іх гонар польскае аб'яднанне аховы ваенных помнікаў устанавіла крыж з чорнага граніту з выявай Маці Божай і двума плітамі з імёнамі ахвяр гітлерызму. На помніку словы *"Pamieci polacov ofiar hitleryzmy. 1942. Памяці палякаў ахвяр гітлерызма"*. Помнік знаходзіцца за 1,5 км на паўночны захад ад горада Глыбокае.

Дадатак 3

# Мемарыял спаленым вёскам Глыбоцкага раёна

Над спаленай вёскай,
адзетай жалобным гранітам,
Званы абзываюцца
рэхам вайны незабатым
*Аркадзь Куляшоў*







Непадалёк ад дарогі, на маляўнічым месцы каля в. Лаўрынаўка стаіць памятны знак на ўшанаванне памяці жыхароў 17 спаленых вёсак раёна: Лаўрынаўка, Галубічы, Мурзы, Слабада, Барыкоўшчына, Чашкі, Бабуліна, Калечполле, Скрабатуны, Гарані, Галінова, Латышы, Вострава, Хралы, Пліса, Надазе'е, Вуглы…

Бетонны дах хаты, 17 мармуровых пліт з надпісамі вёсак, алеі з блакітных вёсак і туі. І вечны агонь – сімвал жыцця на зямлі.

Дадатак 4

## Помнік вязням гета






Гета ў Глыбокім існавала з верасня 1941 года да жніўня 1943года. Першапачаткова ў ім ўтрымлівалася каля 8 тысяч яўрэяў. Масавае забойства пачалося са снежня 1941 года. Расстрэл быў у Барку, за 1,5 км ад Глыбокага. Усяго ў гета загінула больш за 10 тысяч чалавек.

Дадатак 5

# Глыбокае. Брацкая магіла воінаў і партызан, якія загінулі пры вызваленні Глыбоцкага раёна ў ліпені 1944 года





Брацкая магіла знаходзіцца на вуліцы Леніна, на беразе возера Кагальнае. Тут пахаваны астанкі 180 воінаў Савецкай Арміі і партызан, якія загінулі пры вызваленні Глыбоцкага раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў у ліпені 1944 года. Пасля вайны вакол магілы быў закладзены парк, а ў 1964 годзе пастаўлены абеліск, справа размешчана скульптура салдата, злева – жанчыны. У 1994 годзе стары помнік быў абноўлены.

На магіле пастаўлены помнік: скульптуры двух воінаў і чатыры пліты з імёнамі загінутых. У цэнтры ўзвышаецца абеліск з фігурай грэцкай багіні перамогі – Нікі. Перад абеліскам устаноўлены каваны крыж. Перад крыжом – пліты з імёнамі загінутых. На помніку знак “Воінскае захаванне № 4060”.

Дадатак 6

## Помнік падпольшчыкам Глыбоцкага падполля





Помнік падпольшчыкам Глыбоцкага падполля, якое дзейнічала ў горадзе з восені 1941 года пад кіраўніцтвам Ю.А.Сабалеўскага і І.Ф.Лакоткі урачыста адкрыўся напярэдадні Дня Перамогі ў 1995 годзе. Помнік уяўляе сабой высокую стэлу з двума перакрыжаванымі савецкім і нямецкім аўтаматамі наверсе, побач дзве вертыкальныя пліты з надпісамі. На знаку надпіс “Ветэранам Вялікай Айчыннай вайны ўдзячныя нашчадкі”. На плітах надпісы *“Ратаванне дзяржавы – лёс Беларуса”* і *“Гераічным дзеянням 1942-1944гг. падпольшчыкаў пад кіраўніцтвам Сабалеўскага Ю.А., Лакотка І.Ф. прысвячаецца”*. Помнік размешчаны ў г.Глыбокае па вуліцы Савецкай у прыгожым месцы, амаль на беразе возера Беразвецкае. Аўтар праекта мінскі

скульптар Р.Б.Мурамцаў. Асноўны аб’ём работ выконвала малое прадпрыемства “Спадарожнік” (кір.А.І.Шыпко), МПМК-49 і РВА ЖКГ.

Дадатак 7

## Падсвілле. Брацкая магіла воінаў і партызан





У цэнтры г.п.Падсвілле, у скверы, знаходзіцца брацкая магіла савецкіх воінаў і партызан. У ёй пахаваны 101 воін і 11 партызан, якія загінулі ў ліпені 1944 г. на тэрыторыі былога Плiскага раёна. Імёны 62-х вядомы, 50 –

невядомыя. Сярод пахаваных і астанкі юнага партызана брыгады “Кастрычнік” Васі Мармашова.

У 1962 годзе на брацкай магіле пастаўлены помнік – скульптура воіна, які трымае вянок. Аўтар помніка невядомы. На помніку шыльда *“Воінскае пахаванне №4061”.*

Рашэннем выканкама Віцебскага абласнога савета народных дэпутатаў ад 27.12.1990 № 348 брацкая магіла савецкіх воінаў і партызан у г.п.Падсвілле ўнесена ў Дзяржаўны спіс нерухомых помнікаў гісторыі мясцовага значэння.

**Сцежкі памяці**

Ляжаць у зямельцы адной
Усе, загубленыя вайной...
Хто ў лесе, полі, каля дарогі...
Сцежкі бягуць па многіх.
І вецер шэпча зялёны
Пра вочы іх і імёны.
Ля абеліскаў – бярозкі. клёны.
На плітах Славы стаяць імёны
У лесе,полі, каля дарогі.
Прыйшлі імёны Перамогі.
Стаіць салдат нерухомы.
Сцішымся ля яго мы.
Час няспынны, імклівы,
Хор птушыны гуллівы –
Голас зямлі вясенняй
Не выведзе з задумення,
Неба памяці не захмарыць,
Промні думак не перасее...
Прыехалі дзеці да камісара
Дзягілева Яўсея.
Сталі перад салдатам:
– Дзень добры, тата...
(Лес зашумеў удалечы...)
Тата, я – сын твой Валічак...
Які сум па табе чэрпае
З трыццатага чэрвеня...
– Сынок, ты ведаеш, дзе я?..
Чытаюся на пліце я...
Жывыя перасялілі
У брацкую...
У Падсвілле...
Ляжаць у зямельцы адной
Усе, загубленыя вайной.
А далечыня яснее,
На пліты помнікаў промні сее.
Дажджы праходзяць па абелісках
Каля далёкіх дарог і блізкіх...
І вецер шэпча імёны...
Пра вочы іх і імёны...

*Марыя Баравік*

Дадатак 8

## Вёска Кішы. Помнік землякам, загінуўшым у гады Вялікай Айчыннай вайны





У цэнтры вёскі Кішы ў 1967 г. пастаўлены помнік землякам, загінуўшым у гады Вялікай Айчыннай вайны.

Пазней быў устаноўлены новы помнік, які выдзяляецца сярод помнікаў, устаноўленых на цэнтральных сядзібах раёна і ўяўляе сабой трохбаковую стэлу. На фасадзе – фігура воіна з аўтаматам. Наверсе – барэльефы мірных жыхароў.

На помніку надпіс *«Светлай памяці аднавяскоўцаў, загінуўшых у гады Вялікай Айчыннай вайны»*. Па баках – шыльды са *“Спісам грамадзян СВК “Свіла”, якія загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны”*.

На плітах - імёны загінуўшых воінаў з вёсак Баяры, Гадзішча, Дабрэзіна, Лепляне, Мазнева, Маргі, Кішы, Перадолы, Прапелеўшчына, Свіла-1, Свіла-2, Перавоз, Цінаўка, Якубаўшчына. Усяго 121 імя.

Дадатак 9

## Вёска Галубічы. Помнік ахвярам вайны




У 1964 годзе ў в.Галубічы пастаўлены помнік землякам, бязвінным ахвярам вайны. На помніку надпіс *“Вечная слава героям, павшим в боях за свободу и независимость нашей Родины”* і прозвішчы загінуўшых. Сярод іх 13 чалавек, імёны якіх узгаданы і 16 безымянных мірных жыхароў. Помнік – бетонная стэла, наверсе – чырвоная зорка.

Дадатак 10



Брацкая магіла абаронцаў Айчыны і ахвяр вайны. У 1942 г. ва ўрочышчы Жвіроўня каля в.Галубічы нямецка-фашысцкія захопнікі расстралялі 100 савецкіх актывістаў, жыхароў в.Галубічы і іншых навакольных вёсак. 46 імён загінуўшых вядомы, 54 – невядомы. Помнік з бетону на месцы гібелі быў устаноўлены ў 1964 годзе. Помнік уяўляў сабой

бетонны абеліск з зоркай наверсе. На ім быў надпіс: *“Вечная память героям, павшим в борьбе с немецко-фашистскими захватчиками в Великой Отечественной войне”* і дошка з імёнамі загінуўшых.

У 1998 годзе на месцы брацкай магілы ўстаноўлены новы помнік. На гранітным абеліску выбіты імёны загінуўшых.

На помніку шыльда *“Воінскае пахаванне №5598”*. Помнік знаходзіцца за 200 м. на поўнач ад вёскі Галубічы.

Дадатак 11

## Вёска Каралевічы



Помнік на брацкай магіле жыхароў в. Каралевічы, расстраляных гітлераўцамі 7 лістапада 1942 г. Сярод расстраляных – паэт Алесь Дубровіч, яго бацька і два браты. На помніку надпіс *“Редько Егор Францевич 1872. Сыновья Алексей 1910, Василий 1905, Дмитрий 1903, Капшуль Василий* Петрович *1989 погибли в 1942 году”* і шыльда *“Воінскае пахаванне №5595”*.

Дадатак 12

## Вёска Празарокі. Брацкая магіла савецкіх воінаў і партызан

 

У цэнтры вёскі Празарокі знаходзіцца брацкая магіла савецкіх воінаў і партызан, у якой пахаваны 210 чалавек – 58 вядомых і 152 невядомых воінаў і партызан, якія загінулі ў баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у 1941-44 гг.. У 1957 годзе на магіле быў пастаўлены помнік – скульптура жанчыны, якая трымае букет кветак у руцэ. Аўтар помніка невядомы.

Напрыканцы кастрычніка 2006 года ў Празароках актыўна развярнуліся работы па ўстаноўцы новай манументальнай кампазіцыі - дзвюх стэл (ірваных асколкамі снарадаў) з увекавечанымі на іх імёнамі загінуўшых і дрэва смутку, якое удала дапаўняе кампазіцыю.

Над праектам працавалі прызнаныя майстры сваёй справы - скульптар, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Савецкага Саюза, аўтар мемарыяльнага комплексу "Хатынь" Юрый Міхайлавіч Градаў, скульптары Уладзімір Іванавіч Жбанаў і Аляксандр Іванавіч Тухто. Ідэйным натхняльнікам і ініцыятарам усіх рабочых момантаў быў райвыканкам. Работы па мантажу помніка вяліся пры непасрэдным удзеле Аляксандра Тухто.

На помніку шыльда *“Воінскае пахаванне №4062”*. Брацкая магіла савецкіх воінаў і партызан у в.Празарокі ўключана ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь.

Дадатак 13

# Вёска Чарневічы. Помнік-абеліск землякам, загінуўшым у гады Вялікай Айчыннай вайны





Першы помнік-абеліск землякам, загінуўшым у гады Вялікай Айчыннай вайны, быў устаноўлены ў цэнтры в.Чарневічы ў 1975 г. На помніку меўся надпіс “*Вечная память павшим в 1941-1945 гг.*” і імёны 23 землякоў.

У 2008 г. у Чарневічах устаноўлены новы помнік работы беларускіх скульптараў – лаўрэата Дзяржаўнай прэміі СССР, аўтара мемарыяльнага комплексу "Хатынь" Ю.М. Градава, Ул.І. Жбанава і А.І. Тухто. Скульптары распрацавалі і стварылі кампазіцыю "Пахавальная". Помнік створаны ў выглядзе пахаванкі, прабітай асколкам і падгарэлай з аднаго боку, з высечанымі золатам імёнамі 41 земляка, якія загінулі ў 1941-1945 гадах.

Дадатак 14

# Урочышча Марусіна. Памятны знак ахвярам халакосту



Памятны знак ахвярам халакосту ўстаноўлены ва ўрочышчы Марусіна, што непадалёку ад вёскі Празарокі.

Толькі ў 2002 г. было знойдзена месца, дзе ў час ваеннай блакады 1944 г., былі спалены жыхары вёсак Ксты, Рабчонкі, Ядлоўцы. На месцы гібелі мірных жыхароў пастаўлены памятны знак у выглядзе драўлянай тумбы з зоркай наверсе.

Тут сэрцаў боль і страшная пакута,

Як цяжка слухаць вечныя званы…

У кожнага ў душы зацяты смутак

Пра тых, што не вярнуліся з вайны.

Змахнуў слязу з вачэй пры успаміне

Усё сцярпеў і вынес мой народ.

Як і ў Хатыні .попел тут не стыне,

Гарачы попел тых ваенных год.

*Я.Лукашэвіч "Попел тут не стыне"*

Дадатак 15

# Галубіцкая пушча. Курган Славы

Мы помстай сваёй начынялі гранаты
І слёзы, як кулі, паклалі ў набой.
Народныя мсціўцы, лясныя салдаты,
За волю і шчасце мы выйшлі на бой...
Г.Бураўкін








У кастрычніку 1943 – маі 1944 гг. нямецка-фашысцкія акупанты з мэтай акружэння і разгрому партызан Полацка-Лепельскай зоны правялі аперацыю “Веснавое свята”. Супраць народных мсціўцаў было кінута больш 60 тыс. салдат і афіцэраў рэгулярных частак, знятых з фронту, войк СС і паліцэйскіх, вялікая колькасць ваеннай тэхнікі.

З карнікамі вяла бой партызанская брыгада імя Суворава І-га Вілейскага аб’яднання (камандзір П.А.Хомчанка, камісар М.А.Усаў). Сумесна з брыгадай ім.Кароткіна Віцебскага аб’яднання яна трымала 25-ці-кіламетровы ўчастак абароны ўздоўж возера Шо і на правым беразе р.Шоша на тэрыторыі Глыбоцкага раёна. Абедзве брыгады налічвалі каля 1200 партызан. Нягледзячы на перавес у сілах ворага 3-4 мая брыгада ім. Суворава прарвала блакаду, разграміла варожы гарнізон на станцыі Кульгаі і выйшла з акружэння.

Узвядзенне Кургана Славы закончылася летам 1970 г. Па трох трапах, як па жывому канвееру, зямля падавалася наверх у вёдрах. Побач, на лузе, наразаўся дзёран і дастаўляўся да кургана. Ім замацоўваліся схілы. На схілах кургана 2 пліты, на якіх выбіты імёны 9 партызан кулямётнага разліку, што загінулі ў час прарыву варожай блакады. Каменшчык-гравійшчык В.В.Пліско нанёс наступны надпіс: *«22 апреля 1944 года на этом месте в неравной борьбе против немецко-фашистских захватчиков геройски погиб пулемётный расчет бригады имени Суворова — командир отделения Заяц С. П., рядовой Мирош В. П.»* Побач другі надпіс: *«В апреле 1944 года на рубеже реки Шоша против немецко-фашистских захватчиков пали смертью героев бойцы партизанской бригады имени Суворова: начальник штаба отряда «Большевик» Вяльцын Д. Ф. 1912 г., погиб 25 апреля 1944 г., бойцы отряда*

*имени Чкалова Дударенко В. И. 1909 г., погиб 14 апреля 1944 г., Марцинкевич А. А. 1923 г., погиб 22 апреля 1944 г., Конон А. И. 1924 г., погиб 27 апреля 1944 г. Лишевский И.И. 1911 г., погиб 27 апреля 1944 г., Беглик Г. И. 1913 г., погиб 27 апреля 1944 г., боец отряда «Большевик» Харевич Н. А. 1922 г. погиб 25 апреля 1944 года. Вечная память павшим в боях за честь и независимость Отчизны, за счастье и свободу народов!»*

## Помнік-стэла на месцы дыслакацыі Штаба 1-й партызанскай брыгады імя А.В.Суворава





Стэла на месцы дыслакацыі Штаба 1-й партызанскай брыгады імя А.В.Суворава Вілейскага злучэння ў вёсцы Ліпава. Партызаны брыгады праводзілі дыверсіі на камунікацыях праціўніка, удзельнічалі ў "рэйкавай вайне" на ўчастку Крулеўшчына – Варапаева.

У памяць аб гэтых баях у 1964 г. пастаўлены помнік-стэла. На ім здалёку бачны Ордэн Вялікай Айчыннай вайны і надпіс: *"Здесь была организована и вела борьбу с захватчиками бригада имени Суворова"*. Урачыстае адкрыццё помніка адбылося 8 мая 1966 г. Помнік зроблены з камня і цэглы, пастаўлены супрацоўнікамі Глыбоцкага раённага аддзялення сувязі, рабочымі і служачымі саўгаса "Яблынька".

Помнік-стэла знаходзіцца за 2 км на ўсход ад в.Вострава, на ўсходняй ускраіне вёскі Ліпава, на скрыжаванні дарог Подсвілле-Вострава-Кублічы-Ліпава-Псуя.

**Суворовцы насмерть стояли**

Весна наряжалась цветами,
Бежали ручьями снега,
Суворовцы насмерть стояли,
Громили на Шоше врага.
Со свистом здесь падали бомбы,

Летал за снарядом снаряд,
Но каждый суворовец помнил:
Умру, но не шагу назад.
Фашисты, как чёрные тучи,
Падали, громыхая броней,
Товарищи Хомченко, Усов
Вели партизан за собой.
Удавом фашист отползает,
Он ранен, дрожат его губы,
И руки он вверх поднимает,
Пред Валей Мовчун из Обруба.
Мальчишки ходили в разведку,
Сражались с коварным врагом
Стреляли умело и метко
Иван и Евгений вдвоём.
Минуя фашистов засада,
Разбив горнизон в Кульгаях,
Бригада прорвала блокаду,
Добыв себе славу в боях.
Учил полководец Суворов
Высоко держать русский флаг.
Несли его гордо и смело
Суворовцы в залпах атак.
И славя сегодня победу большую,
Клянемся мы все, как один,
Что Родину нашу святую
В обиду нигде не дадим.

*Іван Волкаў*

## Урочышча Зімнік. Абеліск-указальнік месца былога партызанскага аэрадрома




У лясным урочышчы Зімнік пастаўлены абеліск-указацель месца былога партызанскага аэрадрома. Тут у гады Вялікай Айчыннай вайны (1943 г.) знаходзіўся аэрадром партызанскіх брыгад імя А.В.Суворава 1-га Вілейскага злучэння і імя І.І.Кароткіна Віцебскага злучэння, брыгады “Кастрычнік”.

На месцы аэрадрома летам 1976 (1975?) г. ўстаноўлены абеліск-указацель з надпісам “*Здесь в 1943 году был партизанский аэродром бригад имени Короткина, имени Суворова, “Октябрь”*. Абеліск зроблены з мармуровай крошкі майстрамі Пліскага прамкамбіната, устаноўлены работнікамі Ліпаўскага лясніцтва. Абеліск размешчаны за 5 км ад в.Ліпава, за 8 км ад в.Альховікі, па дарозе Падсвілле – Чыстае – Ліпава – Кублічы.

## **Памятны знак на месцы размяшчэння штаба партызанскай брыгады імя Суворава**






Памятны знак размешчаны ва ўрочышчы Чыстае за 1 км на паўднёвы ўсход ад в.Чыстае, па дарозе Падсвілле – Чыстае – Кублічы. Быў устаноўлены ў 1969 годзе рабочымі Ліпаўскага лясніцтва.

## Памятны знак на месцы жорсткіх баёў каля р.Чысцянка

Берёзы и сосны стоят молчаливо.
Какая за Шошей теперь красота!
Лесная река несёт воды бурливо,
За нею, у хутора, есть высота.

В дни чёрной немецко-фашисцкой блокады
Отряд «Большевик» высоту защищал.
Здесь мстители били врага беспощадно,
Но новые части враг в бой поднимал…
Іван Волкаў




На правым беразе ракі Чысцянка знаходзіцца **мемарыяльны знак** у гонар партызан брыгады «Кастрычнік» Вілейскага партызанскага злучэння, якія ў 1943-44 гг. вялі баі супраць нямецка-фашысцкіх акупантаў. На абеліску надпіс “*Здесь в 1941-1944 годах народные мстители вели бои с неметско-фашистскими карателями*”. Помнік зроблены з камня і цэменту ў 1968 г. (1967?) рабочымі і служачымі Ліпаўскага лясніцтва. Помнік размешчаны ва ўрочышча Чыстае, за 0,5 км на паўднёвы ўсход ад в.Чыстае, па дарозе Падсвілле – Чыстае – Кублічы.

## Брацкая магіла партызана



Помнік на магіле партызана брыгады імя “Кастрычнік”Уладзіміра Калістрата. Установлены ў 1971 годзе рабочымі Ліпаўскага лясніцтва.

Дадатак 16

# Памятны знак на месцы спаленай вёскі Белякі









11 красавіка 1944 г. 15 мірных жыхароў вёскі Белякі сталі ахвярай нямецка-фашысцкіх акупантаў. У ліпені 2009 года памяць аб ахваярах, якія пахаваны на могілках вёскі Іванаўшчына, увекавечана 6-ціметровым крыжом. Крыж устаноўлены работнікамі Глыбоцкага мясакамбіната, сельгаспрадпрыемства "Каралі", Галубіцкага райвыканкама і ўторчармета.

Дадатак 17

## Вёска Ліпава. Брацкая магіла ахвяр фашызму



На брацкай магіле ахвяр фашызму ў вёсцы Ліпава ў 1976 г. пастаўлены помнік на ўшанаванне памяці 12 жыхароў, якіх 28 красавіка 1944 г. загубілі нямецка-фашысцкія акупанты.

На ім надпіс *“Здесь 28 апреля 1944 года немецко-фашистскими захватчиками заживо сожжены мирные жители дер. Липово Перхунович Лукьян – 89 лет, Белинская Анна – 35 лет, Решетник Альжбета – 90 лет, Решетник Марта – 70 лет, Войткевич Анеля – 80 лет, и другие, всего 12 человек”.* Там жа было пахавана 7 невядомых.

На помніку шыльда *“Воінскае пахаванне №5599”*. Помнік размешчаны на ўсходняй ускраіне вёскі Ліпава.

Дадатак 18

## Вёска Вострава. Помнік Плiскім падпольным райкамам КП(б)Б і ЛКС





Помнік Плíскім падпольным райкамам КП(б)Б і ЛКСМБ, якія дзейнічалі ў наваколлі в. Вострава ў 1942-1944 гг.. Помнік уяўляе сабой стэлу са сцягам, на якім выявы партызана і жанчыны. Гэта сімвал таго, што падпольны райкам аб’ядноўваў у антыфашысцкай барацьбе як партызан, так і мірнае насельніцтва. Актыўны ўдзел у падпольнай дзейнасці прымалі і жанчыны.

На помніку надпіс *“Недалеко от этих мест с 1942 по 1944 г. находился Плиский подпольный райком партии и Плиский подпольный райком комсомола. Вечная слава героям, павшим в боях за свободу и независимость нашей Родины”.* Помнік размешчаны ў цэнтры вёскі каля будынка былой Востраўскай школы. Адкрыццё помніка адбылося ў 1984 г.

Дадатак 19

## Вёска Вострава. Брацкая магіла воінаў і партызан






На брацкай магіле воінаў і партызан у вёсцы Вострава, на мясцовых могілках, пастаўлены абеліск з надпісам *“Вечная слава воинам и партизанам, погибшим в боях за свободу и независимость нашей Родины 1941 – 1945”*. На помніку шыльда *“Воінскае пахаванне №4072”*.

Дадатак 20

## Вёска Псуя. Помнік-стэла загінуўшым землякам



На ўшанаванне памяці 75 землякоў, якія загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны **ў** цэнтры Псуі пастаўлены помнік- стэла. На помніку надпіс *“Вечная слава воинам и партизанам, павшим в боях за свободу и независимость нашей Родины в 1941-1945 годах! Памяти павших будьте достойны, вечно достойны. 1941-1945”.*

Помнік зроблены ў 1964 годзе з камня і цэглы рабочымі саўгаса “Яблынька” пад кіраўніцтвам прараба Іванова Рамана Іванавіча, па праекту дырэктара саўгаса Угніча Івана Пятровіча.

## Мемарыяльны знак у гонар генерал-лейтэнанта Казлова Пятра Міхайлавіча





У вёсцы Псуя стаіць мемарыяльны знак у гонар генерал-лейтэнанта**,** Героя Савецкага Саюза, ураджэнца Псуеўшчыны, Казлова Пятра Міхайлавіча. На помніку надпіс *“Памятный знак установлен в честь уроженца деревни Колено Псуевского сельсовета генерал-лейтенанта, командующего армией, Героя Советского Союза Петра Михайловича Козлова. 1893-1944”.*

Побач з помнікам мірным жыхарам знаходзіцца індывідуальная магіла невядомага салдата, які першапачаткова быў пахаваны ў в.Хралы. На магіле пастаўлены помнік у выглядзе бетоннай піраміды з зоркай наверсе. На помніку шыльда *“Воінскае пахаванне №4063”.*

Дадатак 21

## Вёска-партызанка Хралы

"Вёсачка-партызанка", - так кажуць мясцовыя жыхары пра вёску Хралы. У гады вайны партызаны мелі тут прыстанішча. Вяскоўцы захоўваюць памяць аб сваіх продках, якія аказвалі дапамогу патызанам у часы ліхалецця.






Дадатак 22

**Вёска Івесь. Помнік землякам**



Скульптурная кампазіцыя – фігуры мужчыны, двух жанчын і трох дзетак, аднаго з якіх жанчына трымае на руках – даніна памяці мірнаму насельніцтву, якое разам з партызанамі вынесла ўсе цяжкасці ваеннай акупацыі і аперацыі “Прарыў” 1944 года.

З 1412 партызан антыфашысцкай брыгады, якая ішла наперадзе прарыву, загінула больш за тысячу. Згасла падчас аперацыі жыццё і многіх яго сяброў. І сёння ветэран разам з тымі, каму ўдалося выратавацца ў тыя майскія дні, прыходзіць успомніць іх на “Прарыў”.

Прыходзяць не толькі яны. Пакланіцца брацкай магіле, дзе пахавана каля 450 партызан, пастаяць ля 16 моцных дубкоў, што сімвалізуюць стойкія партызанскія брыгады, і пасумаваць разам з ніцымі вербамі на тэрыторыі мемарыяльнага комплексу завітваюць школьнікі, студэнты і абавязкова маладыя — падчас вяселля. Бо немагчыма не аддаць даніну памяці тым, хто падараваў магчымасць жыць і быць шчаслівым.

Дадатак 23

## Помнік спаленай вёсцы Вуглы




У ліпені 1969 года на месцы спаленай вёскі **Вуглы**, на папялішчы хаты Ананіча Юліана Васільевіча ўстаноўлены помнік. На помніку подпіс "*Товарищ! Помни! 2 января 1943 года деревня Углы была сожжена и её 19 мирных жителей расстреляны захватчиками!*"

Помнік зроблены з камня рабочымі саўгаса "Яблынька" і вучнямі Псуеўскай васьмігадовай школы пад кіраўніцтвам прараба Іванова Рамана Іванавіча па праекту дырэктара саўгаса Угніча Івана Пятровіча. Помнік стаіць на скрыжаванні дарог Падсвілле – Вострава – Кублічы – Ліпава – Псуя, за мастом праз раку Шошу.

Дадатак 24

## Вёска Празарокі. Брацкая магіла савецкіх воінаў і партызан








У цэнтры **в. Празарокі** знаходзіцца брацкая магіла савецкіх воінаў і партызан, у якой пахаваны 210 чалавек – 58 вядомых і 152 невядомых воінаў і партызан, якія загінулі ў баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у 1941-44 гг.. У 1957 годзе на магіле быў пастаўлены помнік – скульптура жанчыны, якая трымае букет кветак у руцэ. Аўтар помніка невядомы.

Напрыканцы кастрычніка 2006 года ў Празароках актыўна развярнуліся работы па ўстаноўцы новай манументальнай кампазіцыі - дзвюх стэл (ірваных асколкамі снарадаў) з увекавечанымі на іх імёнамі загінуўшых і дрэва смутку, якое удала дапаўняе кампазіцыю.

Над праектам працавалі прызнаныя майстры сваёй справы - скульптар, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Савецкага Саюза, аўтар мемарыяльнага комплексу "Хатынь" Юрый Міхайлавіч Градаў, скульптары Уладзімір Іванавіч Жбанаў і Аляксандр Іванавіч Тухто. Ідэйным натхняльнікам і ініцыятарам усіх рабочых момантаў быў райвыканкам. Работы па мантажу помніка вяліся пры непасрэдным удзеле Аляксандра Тухто.

Дадатак 25

## Вёска Гатаўшчына. Помнік-абеліск землякам, загінуўшым у гады Вялікай Айчыннай вайны





У цэнтры вёскі Гатаўшчына, побач з будынкам клуба, размешчаны помнік-абеліск землякам, загінуўшым у гады Вялікай Айчыннай вайны. З франтоў вайны ў Гатаўшчыну і навакольныя вёскі не вярнулася дадому 97 чалавек. Помнік пастаўлены у 1967 г. На ім надпіс *“Вечная слава воинам землякам, павшим за Родину. 1941-1945”.*

Дадатак 26

## Брацкая магіла ахвяр вайны, жыхароў-яўрэяў в.Пліса



Брацкая магіла ахвяр вайны, жыхароў-яўрэяў **в.Пліса** знаходзіца за 1 км ад вёскі. Помнік – камень-валун, на якім выбіта шасцівугольная зорка і тэкст: *“Здесь 1 июня 1942 года было расстреляно фашистами 410 еврейских мирных жителей. Вечная им память”.* Усяго на гэтым месцы расстраляна 419 чалавек. Помнік пастаўлены ў 1998 годзе на сродкі, сабраныя яўрэямі-землякамі ў Ізраілі па ініцыятыве Мошэ Цымкінда, цудам уратаваўшагася ад расстрэлу. На помніку шыльда “Воінскае пахаванне №5596”.

Дадатак 27

## Вёска Мнюта. Помнік землякам, загінуўшым у гады Вялікай Айчыннай вайны





Помнік землякам, загінуўшым у гады Вялікай Айчыннай вайны знаходзіцца ў цэнтры **в. Мнюта** каля праўлення гаспадаркі. У гады вайны жыхары вёскі Мнюта і іншых населеных пунктаў актыўна змагаліся за свабоду і незалежнасць савецкай Радзімы. 117 землякоў аддалі жыццё ў барацьбе з нямецка-фашысцкімі захопнікамі. У памяць аб загінуўшых ў 1969 г. узведзены помнік.

Аўтар – жыхар в.Мнюта В.Матюшонак, які самастойна распрацаваў эскіз помніка і пабудаваў яго. Помнік зроблены з бетона і мармуровай крошкі, вышыня помніка 13 м. Ён прадстаўляе сабой трохчастковы абеліск, пастаўлены на конус-пастамент з прыродных валуноў. На сярэдней частцы абеліска – герб Савецкага Саюза, ніжэй – барэльефы савецкіх воінаў і партызан (цэнтральны паказ у фас, бакавыя – у профіль). На помніку змешчаны надпіс *“Священна память о вас 1941-1945”* і дошкі з імёнамі загінуўшых землякоў.

Дадатак 27

## Вёска Мацюкова. Помнік землякам загінуўшым у гады Вялікай Айчыннай вайны

 

У самым цэнтры в. Мацюкова у скверы ля Дома культуры размешчаны помнік 5 землякам, загінуўшым у гады Вялікай Айчыннай вайны. Гэта вечны напамінак аб жудасных падзеях ваеннага часу. Скульптура партызана і

дзяўчыны пастаўлены ў 1975 г. На помніку шыльда з надпісам “Подвиг народа бессмертен. Лермонтов Н.А., Матюшонок М.И., Немиро И.И., Петкевич И.А., Подорский Г.И. ” Аўтар помніка невядомы. 8 мая 1987 г. на цэнтральнай сядзібе калгаса "Рассвет" ў вёсцы Мацюкова адбылося перазахаванне астанкаў былога сакратара Пліскага падпольнага райкама камсамола Мікалая Аляксандравіча Пляхновіча і двух невядомых партызан, які з паслеваеннага часу спачывалі на ўскрайку лесу.

Дадатак 28

## Вёска Стрынадкі





Удзячныя нашчадкі, жыхары калгаса імя Дзімітрава, на цэнтральнай сядзібе гаспадаркі ў вёсцы Стрынадкі паставілі помнік загінуўшым аднавяскоўцам. Помнік быў адкрыты ў 1972 г. і прадстаўляе сабой трохвугольную стэлу з зоркай наверсе і барэльеф салдата.

На помніку з абодвух бакоў надпіс *“За нашу советскую Родину”*, побач дзве пліты з імёнамі 68 загінуўшых землякоў.

Дадатак 29

## Вёска Ломашы. Помнік-абеліск  землякам




1968 годзе ў цэнтры вёскі Ломашы быў пастаўлены сціплы помнік-абеліск  землякам, загінуўшым у гады Вялікай Айчыннай вайны. На помніку былі ўвекавечаны імёны 34 землякоў, загінуўшых у гады Вялікай Айчыннай вайны.

1 ліпеня 2005 года ў Ломашах быў урачыста адкрыты новы помнік. Скульптар А.І.Тухто ў творчым супрацоўніцтве з У.І.Жбанавым арыгінальна падышлі да вырашэння тэмы: з жыццядайнай зямлі, дзе сцелецца кветка-папараць, прарастае дрэва, а вянчае яго буслова крыло.

На пліце ля падножжа помніка прозвішчы загінуўшых.  Імён стала болей – 58.

## Вёска Карабы. Помнік–абеліск землякам





У цэнтры вёскі Карабы на ўшанаванне памяці 16 землякоў, загінуўшых у гады Вялікай Айчыннай вайны, у 1967 г. устаноўлены помнік–абеліск з надпісам *“Вечная слава нашим землякам, погибшим за независисмость нашей Отчизны 1941-1945”* і прозвішчамі загінуўшых.

Напярэдадні Дня перамогі ў вёсцы Карабы Глыбоцкага раёна адбылося ўрачыстае адкрыццё помніка ў гонар землякоў, што загінулі пад час Вялікай Айчыннай вайны. (2010 г.) Новы помнік устаноўлены каля адміністрацыйнага будынку, у якія размешчаны Карабоўскі сельскі Савет і кіраўніцтва ААТ “Канстанцінаў Двор”. На гранітнай пліце зроблены надпіс: *“Вялікая падзяка за мірнае жыццё. Вечная памяць удзячных нашчадкаў”.*

Дадатак 31

## Вёска Гінькі. Брацкая магіла сям'і Шчасных



Брацкая магіла сям'і Шчасных у вёсцы Гінькі, якая была расстраляны фашыстамі за сувязь з партызанамі. На помніку надпіс: *"Загінулі за сувязь з партызанамі. Счасны П.Т. 1872, Счасны П.П. 1912, Счасная Г.Ф. 1917, Счасная Тацяна 4 гады, Счасная Вольга 9 месяцаў, Счасны Дз.М. 1935, Счасная Т.М. 1935"*. Побач з помнікам знаходзіцца жалезны крыж з шыльдай, на якой надпіс *"Без віны вінаватым вечны спакой"*.

Дадатак 32

## Вёска Гірстуны. Брацкая магіла лётчыкаў



Недалёка ад вёскі Гірстуны, ва ўрочышчы "Жукавы пяскі" знаходзіцца брацкая магіла лётчыкаў, загінуўшых у гады Вялікай Айчыннай вайны. Прозвішчы загінуўшых лётчыкаў адшукаў у Цэнтральным архіве Масквы мясцовы краязнаўца П.С.Раловіч. Па яго ініцыятыве на месцы падзення самалётаў верасні 1999 г. пастаўлены помнік у выглядзе гранітнага крыжа і камяня з шыльдай і надпісам: *"На этом месте 3 июля 1944 года погиб в бою экипаж самолёта ИЛ-2 старшина Каргин Григорий Иванович, старший лейтенант Шкарпетов Алексей Иванович. Вечная память героям"*.

Помнік пастаўлены  на месцы падзення самалёта ІЛ-2 683 штурмавога авіяпалка 335 штурмавой авіядывізіі  3 ліпеня 1944 г. Загінуўшыя – малодшы лейтэнат Шкарлетаў Аляксей Іванавіч, 1921 г.н., малодшы сержант Каргін (Карган) Рыгор Іванавіч, 1920 г.н. На помніку шыльда “Воінскае пахаванне №4073”. Помнік знаходзіцца каля в.Гірстуны, па дарозе з в.Новыя Шарабаі на в.СтарыяШарабаі.

Дадатак  33

## Вёска Гулідава. Індывідуальная магіла невядомага воіна



Індывідуальная магіла з драўляным крыжом на месцы пахавання невядомага воіна, загінуўшага ў ліпені 1941 г. на вясковых могілках вёскі Гулідава. Крыж устаноўлены мясцовымі жыхарамі ў 1989 г. На крыжы шыльда *“Воінскае пахаванне №4066”.*

Дадатак  34

## Вёска Дзеркаўшчына.
## Помнік землякам, загінуўшым у гады Вялікай Айчыннай вайны



У цэнтры вёскі Дзеркаўшчына, перад будынкам сельскага Дома культуры, у 1973 г. устаноўлены помнік 36 землякам, загінуўшым у гады Вялікай Айчыннай вайны. Помнік уяўляе сабой пастамент, абмураваны камяням і скульптуру воіна з аўтаматам. На помніку надпіс *“Вечная память павшим землякам в борьбе с немецко-фашисткими захватчиками в годы Великой Отечественной войны. 1941-1945”.*

Дадатак 35

## Індывідуальная магіла невядомага, загінуўшага ў 1941 г



Індывідуальная магіла невядомага, загінуўшага ў 1941 г.? знаходзіцца на могілках вёскі Жураўнёва. Помнік – бетонная піраміда з зоркай, устаноўлены ў 1961 г. На помніку шыльда *“Воінскае пахаванне №4067”.*

Дадатак 36

## Вёска Зарубіна. Помнік — скульптура жанчыны ў жалобе.





У в.Зарубіна каля будынка праўлення былога калгаса «Парыжская камуна» на ўшанаванне памяці 63 землякоў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну у 1975 г. пастаўлены помнік — скульптура жанчыны ў жалобе.

Дадатак 37

# Вёска Латыгаль. Абеліск – мармуровая стэла

 

У вёсцы Латыгаль Карабоўскага сельсавета, у яе жыхароў ёсць свае трагічныя старонкі. 13 чэрвеня 1943 года Латыгаль сапраўды была спаленая, а 10 жыхароў растраляны фашыстамі ва ўрочышчы Асіннікі.

*Гэта Вайцэховіч Іван Купрыянавіч, 1910 г.н., Вайцэховіч Пётр Купрыянавіч, 1920 г.н., Квач Аляксандр, Квач Марыя, Рыжая Караліна Вайцэхаўна, Рыжая Марыя Канстанцінаўна, 1928 г.н., Рыжая Пятруля, 1883 г.н., Рыжая Францішка Ігнатаўна, 1894 г.н., Рыжы Вацлаў Канстанцінавіч, 1926 г.н., Рыжы Іван Восіпавіч, 1919 г.н.*

На месцы расстрэлу мірных жыхароў ва ўрочышчы Асіннікі студэнтамі Віцебскага медыцынскага інстытута быў узведзены абеліск – мармуровая стэла. У 2007 г. астанкі расстраляных былі перазахаронены на могілках в.Харашкі.

Дадатак 38

## Вёска Шунеўцы. Помнік землякам, загінуўшым у гады Вялікай Айчыннай вайны.





У цэнтры вёскі Шунеўцы месціцца помнік землякам, загінуўшым у гады Вялікай Айчыннай вайны. Помнік уяўляе сабой бетонную стэлу, наверсе якой зорка, на помніку – выява Ордэн Перамогі і шыльда з імёнамі 36 землякоў. Абеліск устаноўлены ў 1969 годзе.

Дадатак 39

## Індывідуальная магіла чырвонаармейца Пятра



Індывідуальная магіла чырвонаармейца Пятра, 1922 г.н., які загінуў 12 ліпеня 1941 г. каля в.Бялевічы. На помніку, драўлянай тумбе, шыльда “Воінскае пахаванне №4068” (могілкі в.Белевічы)

Дадатак 40

## Вёска Зябкі. Помнік памяці землякам






Каля канторы былога саўгаса імя Дзяржынскага ў в.Зябкі на ўшанаванне памяці 16 землякоў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, у 1975 годзе пастаўлены помнік – скульпурная кампазіцыя: партызан і партызанка. На пастаменце – выява зоркі з ордэнскай лентай і шыльда з імёнамі загінуўшых землякоў.






Помнік на магіле Лабзова Уладзіміра Канстанцінавіча, старшыні Асінаўскага сельсавета, зверскі забітага ворагамі Савецкай улады пасля

першамайскага сходу ў 1946 г. Знаходзіцца каля будынка былой Зябкаўскай СШ. Новы помнік пастаўлены ў 1988 г.

Дадатак 41

## Вёска Запруддзе. Помнік загінуўшым землякам





Побач з будынкам праўлення былой гаспадаркі “Новый путь” ў в.Запруддзе**,** на ўшанаванне памяці 37 землякоў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, у 1974 годзе пастаўлены помнік – скульптура воіна. На помніку надпіс *“Слава героям, павшим в борьбе с немецким фашизмом за нашу советскую Родину”* і імёны 32 загінуўшых землякоў.

Дадатак 42

## Вёска Капыльшчына. Помнік-абеліск землякам






У цэнтры в.Капыльшчына на ўшанаванне памяці 32 землякоў, загінуўшых у гады Вялікай Айчыннай вайны, у 1968 годзе ўстаноўлены помнік-абеліск. На абеліску надпіс *“Вечная слава землякам, павшим в боях за свободу и независимость нашей родины.1941-1945”* і шыльды з імёнамі 62 загінуўшых землякоў.

Дадатак 43

## Вёска Лучайка. Помнік землякам





Помнік землякам, якія загінулі ў Вялікую Айчыную вайну, пастаўлены ў цэнтры вёскі Лучайка ля будынка былога Дома культуры. Помнік уяўляе сабой гранітную стэлу з сімвалізаванай ордэнскай лентай і выявай Ордэна Перамогі. На помніку шыльды з надпісам “1941-1945”.

Помнік установлены ў 1988 г. *Рашэннем выканкама Віцебскага абласнога савета народных дэпутатаў ад 27.12.1990 № 348 помнік унесены ў Дзяржаўны спіс нерухомых помнікаў гісторыі мясцовага значэння.*



Помнік на месцы расстрэлу сям’і Міроша Нікандра Іванавіча за сувязь з партызанамі. На помніку надпіс “Трагически умерли в 1943 году Мирош Никандр Иванович 1904 г.р., Мирош Елена 19... г.р., Мирош .... 1935 г.р.”
(1 км. ад в.Лучайка)

Дадатак 44

## Вёска Дылевічы. Помнік на месцы расстрэлу за сувязь з партызанамі сям’і Жука Уладзіміра



Помнік на месцы расстрэлу за сувязь з партызанамі ў в.Сасноўка сям’і Жука Уладзіміра. На помніку надпіс *“Здесь похоронены зверски убитые немецкими фашистами за связь с партизанами в 1944 г.”* (пахаванне ў в.Дылевічы)

## А.Вярцінскі. Рэквіем па кожным чацвёртым
## Эпілог. Урок спражэння

Не забываецца той урон,
не зарастаюць прагалы...
«Дзеці, вы вывучылі ўрок?
Дзеці, вы праспрагалі? »
Я іду, ты ідзеш,
а ён не ідзе — ён мёртвы.

Я пяю, ты пяеш,

маўчыць кожны чацвёрты.
Мы ідзём, ідзеце вы.
Грунт пад нагамі цвёрды.
Яны не ходзяць — не жывы
кожны чацвёрты.

Любім мы, любіце вы.
Колькі травы,
ліствы, сінявы! —

Хоць сэрца насцеж разгортвай.
А каб яшчэ ды быў жывы

кожны чацвёрты!